**Міжнародная парламенцкая практыка (IPS)**

**Вы прымаеце актыўны ўдзел у грамадскім, навуковым або палітычным жыцці сваёй радзімы? Ці жадалі б Вы актыўна і адказна ўдзельнічаць у будаўніцтве будучыні сваёй краіны? Ці жадалі б Вы зазірнуць "за кулісы" палітыкі і спазнаць непасрэдна, што такое дэмакратыя?**

Тады скарыстайцеся магчымасцю прыняць удзел у адзінай ва ўсім свеце праграме Нямецкага Бундэстага і берлінскіх універсітэтаў і падайце конкурсную заяўку на ўдзел у Міжнароднай парламенцкай практыцы (Internationales Parlaments-Stipendium – IPS).

Кожны год Нямецкі Бундэстаг у супрацоўніцтве з берлінскімі ўніверсітэтамі дае прыблізна 115 кваліфікаваным маладым людзям з 25 (на сённяшні дзень) краін адзіную ў свеце магчымасць прайсці шматмесячную практыку ў аднаго з дэпутатаў Нямецкага Бундэстага і такім чынам пазнаёміцца з працэсам прыняцця рашэнняў у нямецкай палітыцы і назапасіць практычны досвед ў сферы парламенцкай дзейнасці.

Мэта праграмы – павысіць цікавасць маладых людзей да дэмакратыі і грамадства, заахвоціць і натхніць іх да ўдзелу ў дэмакратычным жыцці. Міжнародная парламенцкая практыка (IPS) – гэта доўгатэрміновая інвестыцыя ва ўмацаванне дэмакратычных каштоўнасцяў і талерантнасці, а таксама ў заахвочванне культурнай разнастайнасці і мірнага супольнага жыцця ў Еўропе.

Удзельнікамі Міжнароднай парламенцкай практыкі з'яўляюцца наступныя краіны: Азербайджан, Албанія, Арменія, Балгарыя, Беларусь, Боснія і Герцагавіна, Македонія, Вугоршчына, Грузія, ЗША, Казахстан, Латвія, Літва, Малдавія, Польшча, Расія, Румынія, Сербія, Славакія, Славенія, Украіна, Францыя, Харватыя, Чэхія і Эстонія.

Праграма Міжнароднай парламенцкай практыкі пачынаецца 1 сакавіка і працягваецца ў цэлым 5 месяцаў. Цэнтральны пункт праграмы – 3,5-месячная практыка ў офісе аднаго з дэпутатаў Нямецкага Бундэстага. Акрамя таго, стыпендыяты наведваюць семінары у пяці палітычных фондах і праходзяць дадатковую навуковую праграму трох берлінскіх універсітэтаў.

Удзельніікі Міжнароднай парламенцкай практыкі атрымоўваюць з бюджэту Нямецкага Бундэстага штомесячную стыпендыю ў памеры 450 еўра. Акрамя таго, Бундэстаг бярэ на сябе выдаткі на пражыванне ў трохпакаёвай кватэры, дзе стыпендыяты жывуць удваіх, а таксама па страхаванні на выпадак хваробы, няшчаснага выпадку і страхаванні грамадзянскай адказнасці. Таксама пакрываюцца выдаткі, звязаныя з прыездам у Берлін і ад'ездам з Берліна.

Усю дадатковую інфармацыю, датычную праграмы Міжнароднай парламенцкай практыкі і падачы конкурсных заявак, Вы знойдзеце па адрасе: www.bundestag.de/ips.

Сардэчна запрашаем Вас прыняць удзел у Міжнароднай парламенцкай практыцы і будзем радыя атрымаць Вашу конкурсную заяўку.